
Святы Мікалай і чаравічкі

Аўтар: Анна Віткоўская
24.11.2011 01:00





6 снежня ка-толікі ўша-ноў-ваюць памяць святога Мікалая, заступніка ван-дроў-цаў і дзяцей. З гістарычных хронік пра зямное жыццё святога Мікалая вядома мала. Ён нарадзіўся на тэрыторыі сучаснай Турцыі прыкладна ў 270 годзе, а памёр 6 снежня 346 года. З маладых гадоў Мікалай прысвяціў сябе служэнню Богу, быў біскупам. Падчас ганенняў на хрысціян Мікалай быў у турэмным зняволенні, але нягледзячы на гэта працягваў прапаведаваць хрысціянства. Пасля прыходу да ўлады імператара Канстанціна, калі пераслед хрысціян спыніўся, Мікалай ізноў стаў кіраваць сваёй паствай. †



Пра добрыя справы святога Мікалая складзены паданні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Яны апавядаюць пра тое, як святы Мікалай дапамагаў бедным і

абяздоленым, а дзецям таемна кідаў манеткі і цацкі ў выстаўленыя за дзверы чаравічкі.

У X стагоддзі ў Кёльнскім саборы ў дзень памяці святога Мікалая (6 снежня) вучням царкоўнапрыходскай школы сталі раздаваць ласункі. А пазней у Германіі дзеці сталі вывешваць у хатах чаравічкі, каб святы Мікалай паклаў туды падарункі. Гэтая традыцыя хутка распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе.

Праўда, падарункі ў гэты дзень атрымліваюць толькі паслухмяныя дзеці.

Прапануем зрабіць чара-вічак з паперы. Хто ведае, можа менавіта ў ім у Дзень святога Мікалая апынуцца цукеркі.